БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб’ект аўтарскага права
УДК [821.161.3.09-3 + 821.162.1.09-3]“18/19”

БАХАНОВІЧ
Наталля Леанідаўна

# КАНЦЭПЦЫЯ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРАЎ НА ПАМЕЖЖЫ XIX–XX СТСТ.

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура
10.01.03 – літаратура народаў краін замежжа (польская)

МІНСК, 2023

Работа выканана ў філіяле
“Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы”
ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

**Навуковы кіраўнік:** **Максімовіч Валерый Аляксандравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела філасофіі літаратуры і эстэтыкі ДНУ “Інстытут філасофіі НАН Беларусі”

**Афіцыйныя апаненты:** **Хмяльніцкі Мікалай Мікалаевіч**, доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры кітайскай філалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Брусевіч Анатоль Аляксандравіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай філалогіі УА “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”

**Апаніруючая арганізацыя:** УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Абарона адбудзецца 1 снежня 2023 г. у 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62); e-mail вучонага сакратара: tsidorova1980@mail.ru; тэл. вучонага сакратара: 8 (017) 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы 25 кастрычніка 2023 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Т.П. Сідарава

# УВОДЗІНЫ

Замацаванне чалавека ў цэнтры філасофска-светапогляднай парадыгмы робіць мяжу XIX–XX стст. часам карэнных змен у традыцыйнай карціне свету беларусаў – насельнікаў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Пераўтварэнне духоўнага аблічча людзей за кошт навукова-тэхнічнага развіцця, сацыяльна-палітычных рухаў і ўзмацнення вагі адукацыі і культуры прадвызначыла станаўленне беларусаў як супольнасці новай эпохі. Гуманітарныя дысцыпліны ўздзейнічаюць на аблічча грамадства, і літаратуразнаўчы погляд з сучаснасці на той перыяд праз прызму канцэпцыі асобы будзе садзейнічаць паглыбленню ведаў пра этнакультурнае самаўсведамленне беларусаў.

**Актуальнасць** выбару беларуска-польскага літаратуразнаўчага вектару для ажыццяўлення кампаратыўнага аналізу мастацкай прозы мяжы XIX–XX стст. абумоўлены як трываласцю геаграфічных і гістарычных сувязей славянскіх народаў ад Сярэднявечча да сённяшняга часу, так і значным уплывам суседніх літаратур на айчынную ў пачатку мінулага стагоддзя. Зварот да прозы малых жанраў у даследаванні перыяду, калі ў польскім мастацтве слова ўпэўненыя пазіцыі займалі і формы рамана, выкліканы не толькі яе прыцягальнасцю для аўтараў з Беларусі. Невялікія творы аператыўна фіксуюць бягучыя змены ў паводзінах і мысленні чалавека, таму разгляд канцэпцыі асобы на матэрыяле гэтага жанравага пласта дазваляе выявіць зрухі ў жыцці, якія прадвызначылі ці маглі б прадвызначыць шляхі культурнага развіцця беларусаў і палякаў у XX, XXI стст.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя непасрэдна звязана з распрацоўкай і выкананнем планавых навуковых тэм аддзела ўзаемасувязей літаратур філіяла “Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы” ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” – “Беларуская і еўрапейскія літаратуры ў агульнай прасторы маральных каштоўнасцей” (2006–2010 гг., № д/р 20072154), “Нацыянальныя тыпы ментальнасці ў беларускай і еўрапейскіх літаратурах: ідэйна-эстэтычная спецыфіка, стылявая эвалюцыя, перакладчыцкая інтэрпрэтацыя” (2011–2015 гг., № д/р 20110553), “Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія: міфы, стэрэатыпы, рэальнасць” (2016–2020 гг., № д/р 20160228), “Беларуская літаратура ў сістэме

еўрапейскага мастацка-стылявога дыскурсу: кантакты, тыпалогія, спецыфіка” (2021–2025 гг., № д/р 20210963).

**Мэта і задачы даследавання**

***Мэта*** даследавання – шматаспектны параўнальны аналіз прысутных у беларускай і польскай прозе малых жанраў на мяжы XIX–XX стст. уяўленняў пра асобу ў яе стаўленні да сваіх светапоглядных вытокаў і асэнсаванні духоўных каштоўнасцей, далучанасці да грамадска-культурных працэсаў і творчай рэалізацыі.

Дасягненне мэты прадугледжвае вырашэнне наступных ***задач***:

– ахарактарызаваць канцэпцыю асобы як сукупнасць уяўленняў пра чалавека ў беларускай і польскай сацыякультурнай прасторы мяжы XIX–XX ст. і як катэгорыю ў літаратуразнаўстве;

– разгледзець сямейна-родавую самаідэнтыфікацыю герояў у перыяд змены сацыяльна-гістарычных парадыгмаў на матэрыяле беларускіх і польскіх навел і апавяданняў;

– выявіць значэнне рэлігіі ў сістэме каштоўнасцей асобы ў кантэксце светапоглядных пошукаў памежжа стагоддзяў у беларускай і польскай прозе малых жанраў;

– асэнсаваць разуменне героямі гістарычнага лёсу свайго народа і ролі мовы ў аспекце нацыябудаўнічых рухаў на аснове беларускіх і польскіх мініяцюр і апавяданняў канца XIX – пачатку XX ст.;

– вызначыць агульнае і адметнае ў вобразе чалавека творчага занятку ў беларускай і польскай малой прозе мяжы стагоддзяў з улікам сацыякультурных працэсаў.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

***Аб’ектам*** даследавання выступае беларуская і польская проза малых жанраў на памежжы XIX–XX стст.: мастацкія творы М. Багдановіча, З. Бядулі, У. Галубка, Ц. Гартнага, А. Гаруна, М. Гарэцкага, Я. Коласа, В. Ластоўскага, С. Палуяна, Цёткі і інш.; Э. Ажэшка, Е. Жулаўскага, С. Жэромскага, Г. Запольскай, М. Канапніцкай, У. Оркана, Б. Пруса, К. Пшэрвы-Тэтмаера, У. Рэйманта, Г. Сянкевіча і інш.

***Прадмет*** даследавання – мастацкая канцэпцыя асобы як сістэма распаўсюджаных уяўленняў пра чалавека ў беларускай і польскай прозе малых жанраў канца XIX – пачатку XX ст.

**Метадалогія і метады даследавання**

Выкарыстоўваецца параўнальны метад, які дазваляе суаднесці ўяўленні пра чалавека ў беларускай і польскай літаратурах. З дапамогай культурна-гістарычнага – прасочваецца ўзаемасувязь адлюстраваных у мастацтве слова поглядаў з тагачаснымі рэаліямі. Зварот да элементаў кантэкстуальнага,

герменеўтычнага, біяграфічнага метадаў дазваляе больш поўна інтэрпрэтаваць канцэпцыю асобы і спецыфіку яе ўвасаблення ў канкрэтных творах.

**Навуковая навізна даследавання**

Вылучаны гістарычныя, грамадскія і культурныя перадумовы ўяўленняў пра чалавека ў беларускім і польскім мастацтве слова памежжа XIX–XX стст.; сістэматызаваны і ўзбагачаны веды пра рух прозы малых жанраў да рознабаковага ўвасаблення героя; абагульнены досвед разгляду канцэпыіі асобы ў літаратуразнаўстве ад часоў узнікнення гэтай катэгорыі, прапанаваны яе азначэнне і спосаб даследавання. У навуковы ўжытак уведзены шэраг твораў суседняй літаратуры, што дазволіла больш поўна ўбачыць панараму развіцця айчыннай. Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў мяжы XIX–XX стст. ахарактарызавана як сукупнасць уяўленняў пра чалавека ў яго ўзаемадзеянні з традыцыяй – родам і верай, нацыябудаўнічымі і культуратворчымі працэсамі. Паглыблены веды пра гістарычныя рэаліі жыцця чалавека і грамадства за кошт выяўлення таго, што пры падобных, хоць і не ідэнтычных умовах у мастацтве слова абодвух народаў праяўляецца выразна ці з некаторымі адрозненнямі або ў адным – становіцца тэндэнцыяй, а ў другім – адсутнічае ці застаецца ў зародку: 1) вобразы пазбаўленых унутранай цэласнасці інтэлігента ў першым пакаленні ў айчыннай літаратуры і жыхара падзеленай на часткі краіны – у суседняй, 2) кансерватыўнасць у рэлігійных пытаннях і высокія патрабаванні да асобы – у беларускай, у польскай – як ідэалізацыя святароў, так і бунт супраць Бога, 3) ідэя прадвызначанасці вяртання дзяржавы і асэнсаваны зварот да роднай мовы: з апорай на знакавыя тэксты культуры – у суседзяў і арыентацыяй на стварэнне беларускамоўнага мастацтва – у айчынным дыскурсе, 4) аднолькавыя вобразы адоранага дзіцяці і няўдалага літаратара, але пры гэтым арыентацыя ў прафесійным станаўленні творчай асобы на асваенне права на ўласны занятак – у беларускай, у польскай – на магчымасць заробку.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Працяглае суіснаванне дзвюх літаратур у адным культурным полі прадвызначыла падобныя ўплывы на ўяўленні пра чалавека на мяжы XIX–XX стст. Пад уздзеяннем агульнаеўрапейскіх настрояў у мастацкай прасторы фігуруюць пазітывісцкая і мадэрнісцкая канцэпцыі асобы, якія праяўляюцца ў розны час і з рознай інтэнсіўнасцю. Агульныя тэндэнцыі развіцця ў беларускай і польскай прозе малых жанраў сведчаць пра ўзмацненне цікавасці да героя і яго ўнутранага жыцця. У літаратуразнаўстве канцэпцыя асобы мае значнасць, таму што дазваляе задзейнічаць вялікі навуковы інструментарый з мэтай ажыццяўлення цэласнага даследавання мастацкага вобраза чалавека. Агульналітаратурны аспект разгляду прадугледжвае адмаўленне ад пошуку

ідэалу, канцэнтрацыю на аўтарскай пазіцыі, прыманне пад увагу ўвасобленага і патэнцыяльнага, улік не толькі сучасных, але і тагачасных крытэрыяў ацэнкі.

2. У выніку маштабных сацыякультурных і дзяржаўна-палітычных пераўтварэнняў на памежжы стагоддзяў важным складнікам канцэпцыі асобы ў прозе малых жанраў выступае сямейна-родавая самаідэнтыфікацыя герояў. Беларуская літаратура, задзейнічаючы ініцыяцыйны змест, сцвярджае значнасць вытокаў у духоўным фарміраванні чалавека (М. Гарэцкі), хоць далёка не ўсе героі абіраюць пазітыўны сцэнарый станаўлення (З. Бядуля, У. Галубок). Польская літаратура закранае шырэйшы сюжэтна-тэматычны спектр узаемадзеяння асобы з сям'ёй і яе гісторыяй: у ім дамінуюць канфлікты прадстаўнікоў розных пакаленняў з-за несупадзення ў каштоўнасных арыенцірах – поглядах на пытанні стасункаў з каланізатарамі (Э. Ажэшка, Г. Сянкевіч) і ідэйна-палітычных перакананнях (С. Жэромскі, Г. Запольская).

3. Стаўленне да інстытута царквы і пошукі героямі сувязі з вышэйшым пачаткам быцця – важны элемент канцэпцыі асобы ў перыяд светапоглядных змен канца XIX – пачатку XX ст. Пісьменнікі разважаюць пра ўстойлівасць новых жыццёвых прынцыпаў і мэтазгоднасць служэння Богу ў храме ці кляштары (М. Гарэцкі, С. Жэромскі, Б. Прус). Роздумы над патрэбай чалавека ў абнаўленні рэлігійных уяўленняў у кожнай з літаратур атрымоўваюць адметную рэалізацыю: польскія героі паказваюць адначасова і традыцыйны (К. Пшэрва-Тэтмаер), і альтэрнатыўны (У. Рэймант) шляхі спасціжэння Бога, а беларускія – усведамляюць неабходнасць ажыццяўлення вялікай духоўнай работы па самаўдасканаленні (З. Бядуля, М. Гарэцкі). Для суседзяў значная праблема канфесійнага гвалту (С. Жэромскі), у той час як айчынная проза сведчыць пра ўсталяванне асобай сувязі са Стваральнікам праз зліццё з эстэтыкай наваколля (Я. Колас).

4. Канцэпцыя асобы адлюстроўвае ўскладненне ўяўленняў чалавека мяжы стагоддзяў пра прыналежнасць да калектыву: проза малых жанраў паказвае асэнсаванне героямі права на афіцыйнае замацаванне рэальных межаў радзімы, самастойнае гаспадаранне ў ёй і легітымізацыю спрадвечнага сродку зносінаў. Прысутная ў жанры мініяцюры цыклічная мадэль светабудовы запэўнівае ў наканаванасці змен, але вобраз асобы ў творах размыты: гістарычная роля чалавека нівелюецца на карысць знешніх фактараў (Я. Колас, С. Палуян, У. Рэймант, К. Пшэрва-Тэтмаер). Суседзі акцэнтуюць чаканне спрыяльнага моманту для пераўтварэнняў, айчынныя аўтары – яшчэ і патрэбу ўсведамлення сябе як нацыі (В. Ластоўскі). Героі асэнсоўваюць уплывовасць моўнага дыскурсу ў калектыўным жыцці: польскія – пакутуючы ад знешняга ўціску (М. Канапніцкая, У. Рэймант, Г. Сянкевіч), а беларускія – сцвярджаючы значнасць і паўнавартаснасць сваёй гаворкі (А. Гарун, М. Гарэцкі, Цётка). Не

меншую вагу мовы паказвае экзістэнцыйны досвед асобы за мяжой: ідэнтыфікацыйную функцыю для палякаў выконваюць знакавыя для культуры тэксты (М. Канапніцкая, Г. Сянкевіч), для беларусаў – самі гукі роднага слова (А. Гарун, М. Гарэцкі).

5. На хвалі мадэрнага ўздыму ў беларускай і польскай сацыякультурнай прасторы памежжа XIX–XX стст. творчыя працэсы становяцца не менш значнымі за сацыяльныя і кладуцца ў аснову нацыя- і дзяржавабудаўніцтва. Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў прадстаўлена вобразам адоранага дзіцяці з вёскі (З. Бядуля, М. Гарэцкі, Б. Прус, Г. Сянкевіч). Яно вылучаецца з кансерватыўнага, матэрыяльна арыентаванага асяроддзя, не знаходзіць у ім падтрымкі, таму нярэдка мае трагічны лёс. Падобныя ў літаратурах і тыпы народнага выканаўцы, непаспяховага дылетанта, творцы ў супрацьстаянні ментальна далёкаму ад яго мяшчанскаму колу рэцыпіентаў (М. Багдановіч, М. Гарэцкі, Г. Запольская, Б. Прус, У. Рэймант). Нацыянальныя адрозненні ў інтэрпрэтацыі відавочныя на прыкладзе ўнутрыасобасных канфліктаў: польскія героі ўсведамляюць сябе прадстаўнікамі самастойнай прафесіі і рэфлексуюць над ёй у каштоўнасным, тэхнічным і асабліва фінансавым аспектах (Е. Жулаўскі, К. Пшэрва-Тэтмаер), а беларускія – асвойваюць права вывесці ўласную дзейнасць за межы спадарожнага занятку (М. Багдановіч, З. Бядуля) і сцвердзіць эстэтычны складнік жыцця (Ц. Гартны, Ядвігін Ш.)

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае даследаванне, у якім упершыню праводзіцца сістэмны параўнальны аналіз канцэпцыі асобы на матэрыяле беларускай і польскай прозы малых жанраў на мяжы XIX–XX стст. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі, таксама напісаны без суаўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прамежкавыя і выніковыя палажэнні даследавання былі прадстаўлены на 26 рэспубліканскіх і міжнародных (у тым ліку 7 замежных) навуковых канферэнцыях: VI Танкаўскіх чытаннях “Ёсць адна Песня песняў – пра Радзіму...” (Мінск, 25–26 кастр. 2007 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Ідэі. Пошукі. Рашэнні” (Мінск, 28 сак. 2008 г.); X Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі “Праблемы славянскай культуры і цывілізацыі” (Усурыйск, 22 мая 2008 г.); XVI Міжнароднай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў “Ламаносаў” (Масква, 13–17 крас. 2009 г.); Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі” (Мінск, 19–20 мая 2009 г.); XVIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Мова і культура” (Кіеў, 22–26 мая

2009 г.); Юбілейнай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны (Гомель, 11 чэрв. 2009 г.); XVI Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Шлях да ўзаемнасці” (Беласток, 25–26 верас. 2009 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі “Творчасць І. Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст” (Мінск, 16 лют. 2010 г.); XVII Міжнароднай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых навукоўцаў “Ламаносаў” (Масква, 12–15 крас. 2010 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі “Творчасць М. Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры” (Мінск, 25–26 ліст. 2011 г.); Літаратурных чытаннях “Іх думкі лунаюць яшчэ над Нясвіжам” (Нясвіж, 15 ліст. 2012 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Імператывы творчасці і гармоніі ў праектаванні чалавекамерных сістэм” (Мінск, 15–16 ліст. 2012 г.); Трэціх навуковых чытаннях імя акадэміка Я.Д. Ісаевіча (Львоў, 7–8 сак. 2013 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства” (Мінск, 3–4 сак. 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Філасофскія веды і выклікі цывілізацыйнага развіцця” (Мінск, 21–22 крас. 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Х Танкаўскія чытанні” (Мінск, 16 вер. 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуска-польскія культурна-моўныя ўзаемаадносіны: ад гісторыі да сучаснасці” (Варшава, 5–6 кастр. 2016 г.); Міжнародных навуковых чытаннях “Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах” (Гомель, 6–7 кастр. 2017 г.); Навуковых “Капыльскіх чытаннях” (Капыль, 20 кастр. 2017 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы” (Мінск, 22–23 сак. 2018 г.); Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях “Спадчына святых Кірыла і Мяфодзія ў сусветнай духоўнай культуры” (Мінск, 30–31 мая 2019 г.); ІІІ Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце” (Віцебск, 20–21 ліст. 2019 г.); XXXIV Навуковай канферэнцыі “Каласавіны” (Мінск, 2 кастр. 2020 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуская літаратура і літаратуразнаўства: канцэпцыі, напрамкі, навуковыя школы” (Мінск, 1–2 крас. 2021 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуская літаратура на сучасным этапе: аўтар, герой, чытач” (Мінск, 21–22 снеж. 2022 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання па тэме дысертацыі адлюстраваны ў 38 публікацыях, сярод якіх 13 артыкулаў – у рэцэнзаваных часопісах (8,7 аўт. арк.), 5 артыкулаў – у навуковых зборніках (2,5 аўт. арк.), 20 – у матэрыялах канферэнцый (6,2 аўт. арк.) Агульны аб’ём апублікаваных тэкстаў складае 17,4 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадатку. Агульны аб’ём дысертацыі складае 159 старонак: асноўны тэкст – 115, бібліяграфічны спіс – 34 (418 пазіцый, з якіх 380 – спіс выкарыстаных крыніц, 38 – спіс публікацый дысертанта), дататак – 10.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Раздзел 1 **“Канцэпцыя асобы: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты”** складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле 1.1 **“Гістарычныя і сацыякультурныя перадумовы мастацкіх уяўленняў пра асобу ў Беларусі і Польшчы на мяжы XIX–XX стст.”** паказваецца, як пасля працяглага існавання ў адным гетэрагенным культурным полі літаратуры адмаўляюца ад ідэалізацыі мінулага на карысць павароту да рэальнага чалавека. Актуальнымі становяцца роздумы на тэму дзяржавабудаўніцтва, і, нягледзячы на розніцу ў ступені нацыянальнага самаўсведамлення народаў, адбываецца ўздым мастацтва слова. Пры неідэнтычных станах развіцця ў абедзвюх літаратурах заяўляюць пра сябе (з рознай інтэнсіўнасцю) рэалістычная і мадэрнісцкая канцэпцыі асобы. Беларускае мастацтва слова не зазнае ўласцівага польскаму супрацьстаяння поглядаў на чалавека і ставіць на першае месца селяніна як асноўнага прадстаўніка нацыі.

У падраздзеле 1.2 **“Спецыфіка і тэндэнцыі развіцця беларускай і польскай прозы малых жанраў памежжа стагоддзяў у святле адлюстравання чалавека”** паказваецца, што ў айчыннай літаратуры адбываецца зараджэнне канону апавядання, навелы, мініяцюры, а ў суседняй – іх росквіт і ўдасканаленне. Калі польскія аўтары дэманструюць перавагу ў колькасці, працягласці і разнастайнасці твораў, то нашаніўцы ўражваюць адразу сталым асваеннем тэм, прыёмаў і сродкаў. Нягледзячы на адрозненні, у прозе малых жанраў вылучаюцца агульныя для абедзвюх літаратур тэндэнцыі, паказальныя з пункту погляду руху да шматграннага выяўлення асобы. Пры ідэйна-тэматычнай і жанравай разнастайнасці твораў мяжы XIX–XX стст. абгрунтаваць стратэгію іх выбару дазваляе паняцце “тыпалогія сутнасцей” (Г. Тврановіч). У кампаратыўным аналізе айчыннай і польскай прозы малых жанраў акрэсленага перыяду пры відавочных часавых несупадзеннях у распаўсюджанні аднолькавых з’яў перспектыўнай выступае арыентацыя ў творчых метадах і напрамках (Ю. Бораў, У. Казбярук).

У раздзеле 1.3 **“Даследаванне канцэпцыі асобы ў літаратуразнаўстве”** аналізуюцца работы, у якіх тэма асобы выступае арганізацыйным цэнтрам. Паказваецца, што і пры вывучэнні іншых пытанняў у галіне мастацтва слова закранаюцца розныя нюансы выяўлення героя. Разглядаюцца погляды польскіх тэарэтыкаў і гісторыкаў літаратуры на пытанне мастацкага ўвасаблення чалавека ў творах. Адзначаецца панаванне міждысцыплінарнага падыходу ў англамоўных даследаваннях вобраза асобы і асабліва ўплыў псіхалогіі. Савецкае літаратуразнаўства ўсталёўвае сувязь паміж канцэпцыяй асобы і мастацкім метадам (Ю. Бораў), распрацоўвае яе тыпалогію (Л. Кіракасян). Прапанаваны ў постсавецкі перыяд Ю. Паўлавым падзел герояў на тры тыпы асобы лёг у аснову шэрагу даследаванняў па тэме. З апорай на тэорыю аўтара (услед за беларускімі літаратуразнаўцамі Г. Пяткевічам, А. Белай) удакладняецца змест паняцця “канцэпцыя асобы”[1], пад якой разумеецца аўтарская пазіцыя (В. Цюпа), і канкрэтызуюцца інструменты даследавання. Дасягненні гуманітарыстыкі (Б. Андэрсан, Э. Гелнер, М. Хайдэгер, Т. Эрыксен) прадвызначаюць вектары аналізу канцэпцыі асобы.

Раздзел 2 **“Духоўныя пошукі героя ў перыяд змены сацыяльна-гістарычных парадыгмаў на мяжы XIX–XX стст.”** прысвечаны разгляду самых кансерватыўных сфер чалавечага жыцця, найбольш адчувальных да крызіснага часу. Гэта момант або развіцця, або дэградацыі, таму што здольнасць спраўляцца з выклікамі выступае крытэрыем асобы і паказвае здароўе грамадства.

У падраздзеле 2.1 **“Сямейна-родавая самаідэнтыфікацыя асобы ў беларускай (З. Бядуля, У. Галубок, М. Гарэцкі і інш.) і польскай (Э. Ажэшка, С. Жэромскі, Г. Сянкевіч і інш.) прозе малых жанраў”** аналізуецца досвед стасункаў герояў з ментальна адрознымі папярэднікамі ці нашчадкамі, паказальны і ў аспекце тагачаснага разумення патрыятызму.

У беларускай прозе малых жанраў прадстаўлены вобраз інтэлігента ў першым пакаленні ва ўзаемадзеянні з вясковым асяроддзем: ён або абірае пазітыўны шлях самаідэнтыфікацыі, набываючы ўгрунтаваны на чысціні сумлення спакой душы (“Роднае карэнне” М. Гарэцкага, “Ганулька” К. Сваяка, “У дома” А. Юшкі), або, не здатны справіцца са складаным комплексам пачуццяў сораму і віны, рухаецца па негатыўным шляху (“На Каляды к сыну” З. Бядулі, “Сын вёскі” У. Галубка, “Бацька і сын” І. Піліпава). Разнастайнасць наратыўных стратэгій (апавядальнік; герой, які самаідэнтыфікуецца; члены

[1] У дадатку высвятляецца змест паняцця “асоба” з апорай як на сучасныя дасягненні навукі, так і на светапоглядныя канстанты канца XIX – пачатку XX ст. Паколькі ідэал здольны аказацца безжыццёвай праекцыяй, а развіццё чалавека з’яўляецца бесперапынным працэсам, у гуманітарыстыцы перспектыўным выступае разуменне асобы не толькі як увасобленага, але і як патэнцыяльнага суб’екта. Адпаведна ў дысертацыі змест паняцця “асоба” вызначае рух чалавека да ўсведамлення сваёй годнасці і самакаштоўнасці ў перспектыве арыентацыі на “іншых” і культуру.

сям’і) не ўплывае на аўтарскую пазіцыю: гістарычная паспяховасць Бацькаўшчыны звязваецца з усведамленнем гонару прыналежнасці да свайго роду. Лёс выхадцаў з вёскі ў горад нагадвае ініцыяцыйны сцэнарый, яркім увасабленнем якога становіцца твор “Лазня” М. Гарэцкага. Эпоха мадэрну схіляе чалавека да сепарацыі ад сям’і і роду, якая павінна быць рэалізавана з захаваннем добрых стасункаў.

Тэма адчужэння ад каранёў селяніна, які здолеў паспяхова выкарыстаць сацыяльныя ліфты, знаёмая і польскай літаратуры (“Прыгожая Галька” М. Хаген), але не ўтварае ў ёй тэндэнцыі. Суседзі дэманструюць іншы спектр асэнсавання светапоглядных вытокаў, увасабляючы яго і на няпольскім матэрыяле, як у творы “Сахем” Г. Сянкевіча. Канцэпцыя асобы выяўляе праблему ўзаемадзеяння мясцовага насельніцтва з каланізатарамі (“Афіцэр” Э. Ажэшка, “Лясное рэха” С. Жэромскага), у тым ліку і праз заключэнне шлюбаў, якое ў пісьменніц-жанчын парадаксальна атрымоўвае пазітыўную ацэнку (“«Немчыкі»” М. Канапніцкай, “За веру і айчыну!” М. Радзевіч). Сямейна-родавая самаідэнтыфікацыя асобы паказвае супрацьлеглае разуменне блізкімі людзьмі перспектыўнага шляху грамадскага развіцця (“Ды прыйдзе царства тваё” Г. Запольскай). Канфлікт прадстаўнікоў розных пакаленняў на ідэйна-светапогляднай глебе адлюстроўвае зніжэнне значнасці прозвішча як родавай каштоўнасці, што супярэчыць традыцыйным уяўленням (“З мёртвых дзён” Ц. Валеўскай, “Доктар Пётр” С. Жэромскага).

Калі ў беларускай прозе асноўная работа па гарманізацыі сямейнай сістэмы кладзецца на маладое пакаленне, то ў польскай – гэту задачу павінны выканаць старэйшыя члены сям’і. Разгортванне чалавечых лёсаў і гістарычныя рэаліі жыцця народаў паказваюць не толькі трагічнасць ці складанасць, але часам і немагчымасць набыцця героямі сталай сямейна-родавай ідэнтычнасці.

У падраздзеле 2.2 **“Рэлігія ў сістэме каштоўнасцей чалавека (паводле твораў М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага, Я. Коласа, У. Оркана, Б. Пруса, К. Пшэрвы-Тэтмаера, У. Рэйманта і інш.)”** паказваецца, што канфесійная прыналежнасць не пазбаўляе чалавека ад неабходнасці ажыццяўлення асабістых пошукаў сувязі з вышэйшым пачаткам быцця. Героі вымушаны ўзгадняць перанятыя ад продкаў біблейскія законы з уласнай карцінай свету, сфарміраванай у абставінах уплыву філасофіі XIX – пачатку XX ст. і ўзмацнення навуковага дыскурсу. Беларускія і польскія аўтары засяроджваюцца на падобных аспектах духоўнага жыцця асобы: у апавяданнях “Стары прафесар” М. Гарэцкага і “Прывід” Б. Пруса правяраецца ступень устойлівасці набытых героямі жыццёвых прынцыпаў перад уладай спрадвечнага і архетыповага, якое аказваецца мацнейшым; у творах “Чарнічка”

М. Гарэцкага і “Спакуса” С. Жэромскага, наадварот, ставіцца пад сумненне мэтазгоднасць служэння Богу ў храме ці кляштары.

У атмасферы, створанай польскім каталіцтвам і яго жорсткімі абмежаваннямі, ступень стрымлівання асобы прапарцыянальная радыкальнасці выказанага пратэсту. На хвалі мадэрнізму ў супраціўленне рэгламентаванаму спосабу жыцця прапаноўваецца новая рэлігійная канцэпцыя чалавека, у распаўсюджанні якой значная роля належыць С. Пшыбышэўскаму. Раскаваны маладапольскі герой спазнае Бога праз сексуальны досвед (“Знак” М. Кшымускай-Іваноўскай, “Перад світаннем” У. Рэйманта) ці ўвогуле ставіць пад сумненне існаванне Усявышняга (мініяцюры Е. Жулаўскага). Пры гэтым статус касцёла ў духоўным жыцці чалавека па-ранейшаму высокі, пра што сведчаць апавяданні “Ксёндз Пётр” К. Пшэрвы-Тэтмаера, “Пробашч з Шэтыны” М. Хаген, у цэнтры якіх знаходзяцца ўзорныя вобразы святароў. Адносная лаяльнасць праваслаўя да рэшткаў язычніцкага светапогляду пазбаўляе беларусаў дысбалансаў у духоўных пошуках: героі выглядаюць больш “цнатліва” (“Мадонна” М. Багдановіча), за выключэннем правакатыўнага аблічча манашкі ў апавяданні “Памылка” М. Гарэцкага. Вобраз айчыннага селяніна неадназначны: ён паўстае і вернікам, які ўсведамляе вагу рэлігіі як часткі культурнай традыцыі (“Адгукнуўся” Я. Коласа), і непаслядоўным у царкоўных прадпісаннях (“Круцель” У. Галубка). Нярэдка ўласцівае беларусам іранічнае стаўленне да ўстаноўленых правілаў у польскай прозе прысутнічае толькі як выключэнне (“Нявернік” У. Оркана). Прадстаўнікі духавенства фігуруюць у айчынных творах эпізадычна, а ў якасці святога прапануецца вобраз вясковага пакутніка, роўнавялікі ідэалізаванаму польскаму ксяндзу (“Вялікі пост” З. Бядулі). Нашаніўскія пісьменнікі прад’яўляюць высокія патрабаванні да асобы: заклікаюць яе да адказнасці, незалежна ад умоў (“Сон Анупрэя” і “Панас на небе” З. Бядулі), і выпрацоўкі ўласных унутраных апор (“Прысяга” М. Гарэцкага).

Немалое значэнне ў рэлігійнай карціне свету чалавека мае канфесійная гісторыя народаў – прымусовая змена веравызнання: у польскіх аўтараў гвалт атручвае духоўнае жыццё селяніна, дэфармуе стасункі з Богам, вынішчае веру і нават вядзе да смерці (“уніяцкія” творы С. Жэромскага); у беларускіх – негатыўны досвед пераадольваецца пантэістычным разуменнем Бога, сувязь з якім усталёўваецца праз зліццё з прыродай (“На начлезе”, “Казкі жыцця” Я. Коласа).

Раздзел 3 **“Асоба ў гісторыя- і нацыятворчых працэсах канца XIX – пачатку XX стст.”** паказвае ўсведамленне героямі прыналежнасці да вялікай супольнасці і роздумы над агульнымі духоўнымі каштоўнасцямі. Гэта выяўляецца ў заклапочанасці пытаннямі мінулага, цяперашняга і будучыні

народа, абароны спрадвечнай мовы, а цікавасць да пералічаных тэм выступае мерай асобаснай сталасці.

У падраздзеле 3.1 **“Чалавек у цыклічнай мадэлі культурна-гістарычнага хранатопа ў мініяцюрах С. Жэромскага, Я. Коласа, В. Ластоўскага, С. Палуяна, К. Пшэрвы-Тэтмаера, У. Рэйманта і інш.”** аналізуецца абліччча героя ў заснаваных на міфалагічных уяўленнях мадэрнісцкіх творах. У адрозненне ад фатальнага філасофскага погляду, у мастацтве слова ідэя цыклічнасці светабудовы нясе адраджэнскі змест: каб абгрунтаваць неабвержнасць набліжэння станоўчых змен у сферы нацыянальна-культурнага і дзяржаўна-палітычнага жыцця, дзеянне ў мініяцюрах разгортваецца паводле ланцужка “росквіт – заняпад – адраджэнне”. Пісьменнікі выкарыстоўваюць як аднолькавыя вобразы – звона (“Хрыстос уваскрос!” С. Палуяна, “Звон з расколінай” У. Рэйманта), так і адрозныя: у айчыннай прозе малых жанраў – лес, Вёска, Жывая Вада (“Жывая вада” Я. Коласа, “Вёска” С. Палуяна), у польскай – сонны народ (“Сон пра шпагу” С. Жэромскага, “Сонныя рыцары” К. Пшэрвы-Тэтмаера).

Аблічча асобы ў творах размытае, што характэрна для жанра мініяцюры, мастацкімі сродкамі якой аўтары ўвасабляюць не чалавечую адзінку, а вобраз нацыянальнай супольнасці ў хадзе часу, нівелюючы ролю асобы ў гісторыі праз акцэнтаванне наканаванасці змен. Палякі абгрунтоўваюць неабходнасць прытрымлівацца дэтэрмінаванага шляху і чакаць спрыяльнага моманту, якім традыцыйна бачацца маштабныя грамадска-гістарычныя падзеі, напрыклад вайна. Беларусы ўсведамляюць наяўнасць у супольнасці больш складаных задач, таму аўтарскую пазіцыю вызначае зварот да біблейскай гісторыі: ахвяра чалавека на алтар нацыі апраўдваецца з пункту погляду трансцэндэнтнай сутнасці (мініяцюры С. Палуяна, “Мары” В. Ластоўскага).

У падраздзеле 3.2 **“Этнакультурная і моўная самаідэнтыфікацыя герояў беларускай (А. Гарун, М. Гарэцкі, Цётка і інш.) і польскай (М. Канапніцкая, А. Свентахоўскі, Г. Сянкевіч і інш.) прозы малых жанраў”** паказваецца, як этнічная ідэнтычнасць, якая для вялікай колькасці беларускага насельніцтва з-за дынамікі зместу этнонімаў і палітонімаў, а для польскага – і тэрытарыяльнай разарванасці вызначаецца ўнутранымі, а не знешнімі межамі, пачынае змяняцца нацыянальнай. Новыя дзяржаўныя ўтварэнні будуюцца на аснове культуры, гісторыі і традыцыі, наратыў якіх абапіраецца на родную мову, таму чалавек уздымае пытанні легітымізацыі і паўсюднага выкарыстання спрадвечнага сродку зносінаў. Нацыянальныя інтэрпрэтацыі канцэпцыі асобы адрозніваюцца: польскія героі пакутуюць ад моўнага ўціску ў сферах адукацыі і рэлігіі (апавяданні Ц. Валеўскай, “У вінным форце” М. Канапніцкай, “У прускай школе” У. Рэйманта, “Карл Круг”

А. Свентахоўскага, “З дзённіка пазнанскага настаўніка” Г. Сянкевіча); беларускія – сцвярджаюць, што іх “жывая” гаворка заслугоўвае прызнання і ўсеагульнага ўжытку (“Пан Шабуневіч” А. Гаруна, “Рунь” М. Гарэцкага, “«Дзеравеншчына»” Я. Коласа, “Таклюся-сухотніца” К. Лейкі, “Мая вёска” Цёткі).

Істотнае ідэнтыфікацыйнае значэнне пераняты ад продкаў сродак зносінаў мае для чалавека, які знаходзіцца ў іншым культурным асяроддзі. Вернасць Бацькаўшчыне ў форме не столькі настальгіі, колькі здольнасці ўспрымаць сябе праз далучанасць да спадчынных мовы і традыцыі робіць асобу часткай вялікай супольнасці. Лёсы герояў адлюстроўваюць гістарычныя шляхі беларускай і польскай інтэлігенцыі, вымушанай эмігрыраваць па палітычных прычынах, адбываць пакаранне ў высылцы, а таксама ніжэйшых сацыяльных слаёў, якім даводзіцца шукаць лепшай долі ці ўцякаць ад вайны. Моўная сітуацыя ў трох розных частках Польшчы адрозніваецца, але этнанацыянальная супольнасць існуе і без дзяржавы, абапіраючыся на важныя для самавызначэння знакавыя тэксты культуры – “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча (“У 1835 годзе” М. Канапніцкай, “Вартаўнік маяка” Г. Сянкевіча), Біблія Я. Вуека (“Сустрэча ў Марыпозе” Г. Сянкевіча). Фарміраванне беларускай нацыі вымагае ісці па прадэманстраваным Ф. Багушэвічам шляху – зніжэння вагі шляхецкага з яго польскім складнікам і зварот да сялянскага з яго аўтэнтычнасцю. Таму пісьменнікі не азіраюцца на супольны з суседзямі культурны досвед і абсалютызуюць самі гукі роднай мовы (“Свята” А. Гаруна, “Амерыканец” і “Уцекачы” М. Гарэцкага).

Раздзел 4 **“Канцэпцыя творчай асобы на этапе культурнага ўздыму памежжа стагоддзяў”** ілюструе з’яўленне альтэрнатыўных рэлігійнаму жыццёвых сэнсаў як спосабаў апраўдаць чалавечае існаванне і пакінуць след у калектыўнай памяці. Акцэнтаванне значнасці дзейнасці ў галіне культуры стымулюе з’яўленне вобраза творчага героя ў беларускай і польскай прозе малых жанраў.

У падраздзеле 4.1 **“«Янка-музыкант» Г. Сянкевіча і тэма станаўлення адораных сялянскіх дзяцей у апавяданнях З. Бядулі, М. Гарэцкага, Б. Пруса”** аналізуецца мастацкі вобраз таленавітага малога вяскоўца. Ён адчувае непадобнасць да свайго асяроддзя, не знаходзіць у ім падтрымкі і з цяжкасцю адстойвае права ісці за прыроднымі схільнасцямі (“Велікодныя яйкі” З. Бядулі, “Скрыпачка” М. Гарэцкага, “Антэк” Б. Пруса, “Янка-музыкант” Г. Сянкевіча). Скептычная ацэнка імкнення да музыкі, малявання, разьбярства ўласціва як сялянству, так і шляхце, якая не ўхваляе заняткі за межамі карпаратыўнай традыцыі. Стагоддзямі для забеспячэння эстэтычных патрэб вышэйшае саслоўе запрашала замежных спецыялістаў, таму выяўлены тып

асобы з творчым патэнцыялам па-свойму рэвалюцыйны. Вялікую ролю ў яе прыцягальнасці для беларускіх і польскіх пісьменнікаў, апроч паралелей з іх біяграфіямі, адыгрывае апавяданне Г. Сянкевіча і зроблены ім рэзананс у сацыякультурнай прасторы таго часу. Адоранае дзіця ў творах нярэдка зазнае досвед сіроцтва, матэрыяльных нягод, складанасцей у навучанні. Тыповымі рысамі характару такога чалавека выступаюць абвостраная чуллівасць, духоўны арыстакратызм і слабая адаптыўнасць да сялянскай працы. Будучыня героя часта ўяўляецца аўтарам песімістычна, трагічныя лёсы маюць і дарослыя прадстаўнікі нешараговага для сялянства творчага занятку.

У падраздзеле 4.2 **“Беларуская і польская інтэрпрэтацыі творцы (на матэрыяле прозы малых жанраў М. Багдановіча, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, Е. Жулаўскага, Г. Запольскай, У. Рэйманта і інш.)”** даследуецца ўнутраны свет герояў, якія звязваюць лёс з дзейнасцю у галіне мастацтва. Канцэпцыя асобы ў айчыннай і суседняй літаратурах паказвае разнастайныя праявы крэатыўнага – паняцце творчасці ў тагачаснай інтэлектуальнай прасторы разумеецца шырока. Папулярны вобраз народнага выканаўцы (“Музыка” М. Багдановіча, “Скрыпка” М. Радзевіч і інш.), што звязана і са значнасцю фальклорнага пачатку, і са зменай пазітывісцкага ўтылітарнага разумення творцы на самакаштоўнае мадэрнісцкае з важнасцю музыкі ў ім. Эстэтычныя пошукі чалавека на мяжы стагоддзяў раскрываюцца праз вобразы не толькі героя, але і апавядальніка, у тым ліку блізкага аўтару, і філістара, паколькі інфарматыўная сама свядомасць асобы з уласцівым ёй стаўленнем. У літаратурах прысутнічаюць падобныя тыпы герояў: дылетант з перавялічаным адчуваннем уласнай значнасці (“Зіма” М. Гарэцкага, “Паэт і свет” Б. Пруса), прафесіянал у светапоглядным супрацьстаянні прымітыўным “спажыўцам” вынікаў яго дзейнасці (рускамоўныя апавяданні М. Багдановіча, “Фіялетавыя панчохі” Г. Запольскай, “З дзённіка” У. Рэйманта, “Тая трэцяя” Г. Сянкевіча). Незалежна ад наратыўнай стратэгіі, сутыкненні творцы з далёкімі ад яго каштоўнасцей людзьмі афарбаваны камічна: у айчынных творах пераважае іронія, а суседзі выкарыстоўваюць добрую сатыру.

Разыходжанні ў канцэпцыі асобы паказвае ўнутраны свет герояў: польскія – заняты праблемамі матэрыяльнага забеспячэння, рэфлексіі над зробленым, пошукам дасканалых сродкаў выяўлення (“Дуэт працы” Ц. Валеўскай, “Пасля ўрачыстасці” Е. Жулаўскага, апавяданні К. Пшэрвы-Тэтмаера); беларускія – абаронай права не толькі на творчы занятак, але і на эстэтычную асалоду (мініяцюры З. Бядулі, “На ўсходзе сонца” Ц. Гартнага, “Сасна” М. Гарэцкага, “Васількі” Ядвігіна Ш.). У адрозненне ад айчыннай, у прозе малых жанраў суседзяў прысутнічае герой, які ўсведамляе сябе прадстаўніком самастойнай прафесіі і нават адчувае бацькоўскую падтрымку. У

беларускай рэчаіснасці чалавек пакутуе з-за адсутнасці апоры на папярэднікаў і разрыву з родавай традыцыяй, якога вымагаюць абставіны мадэрну. Для абгрунтавання значнасці творчага пачатку ў апавяданні “Апокрыф” М. Багдановіч не толькі перадае аповед больш аўтарытэтнаму аўтару, але і ўводзіць вобраз Бога. У “Ad leones!” Ц. Норвіда ўнутрыасобасны канфлікт адсутнічае, хоць у апісанай сітуацыі магла б мець месца сапраўдная драма, як у творы “Разьбяр Мэртэн” К. Пшэрвы-Тэтмаера. У час уступлення польскага мастацтва на шлях камерцыялізацыі айчынныя пісьменнікі ставяць пытанне яго прафесіяналізацыі і сцвярджаюць важнасць духоўнага ў жыцці чалавека.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў на мяжы XIX–XX стст. пры наяўнасці тыпалагічных разыходжанняў сутнасна супадае – гэта сукупнасць абумоўленых грамадска-гістарычнымі, навукова-асветніцкімі, філасофска-эстэтычнымі з’явамі ўяўленняў пра чалавека ў яго ўзаемадзеянні з традыцыяй – родам і верай, нацыябудаўнічымі і культуратворчымі працэсамі.

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Супольнасць гістарычных і культурных шляхоў двух народаў і ўздзеянне на грамадскую думку шэрагу аднолькавых фактараў прадвызначае падабенства ўяўленняў пра асобу ў беларускай і польскай сацыякультурнай прасторы памежжа XIX–XX стст. Адмаўленне ад ідэалізацыі Рэчы Паспалітай на карысць звароту да рэальнага чалавека садзейнічае канчатковаму адасабленню і ўздыму дзвюх літаратур. Аблічча асобы вызначаюць еўрапейскія песімістычныя настроі, уплыў філасофскай думкі і іншых літаратур, нацыя- і дзяржавабудаўнічыя працэсы. У Польшчы рэалістычная і мадэрнісцкая канцэпцыі асобы разгортваюцца ў межах філасофска-эстэтычных сістэм пазітывізму і мадэрнізму. У Беларусі прысутнічаюць абодва згаданыя погляды на чалавека ў межах адпаведных літаратурных метадаў. На эстэтычны рух да шматграннага выяўлення героя ўказвае цікавасць як да прозы, так і да яе мабільных і ёмкіх малых жанраў. Пры розніцы ў мастацкай сталасці беларускай і польскай прозы пра аднолькавае ўзмацненне асобаснай праблематыкі сведчаць агульныя тэндэнцыі: наяўнасць дзіцячых твораў, эпізацыя, лірызацыя, цыклізацыя, канцэптуалізацыя, інтэлектуалізацыя, пашырэнне функцый пейзажу, індывідуалізацыя.

У літаратуразнаўстве катэгорыя “канцэпцыя асобы” валодае значнасцю ў сувязі з уласцівай ёй магчымасцю задзейнічаць вялікую колькасць інструментаў і ажыццяўляць цэласнае даследаванне мастацкага вобраза

чалавека. Гэта катэгорыя ўбірае працэсы творчага спасціжэння і выяўлення, філасофскія і эстэтычныя пошукі аўтараў, пазітыўны і негатыўны досвед герояў. Метадалагічна перспектыўным выступае аналіз аўтарскай пазіцыі, якая ўключае неадназначнасць інтэрпрэтацый і рэалізуецца на змястоўным і фармальным узроўнях твора – суб'ектна і пазасуб'ектна. Вызначэнне заканамернасцей ва ўяўленнях пра чалавека абапіраецца на ўвасобленае і патэнцыяльнае, сучасны і тагачасны гуманітарны кантэкст. Разгляд агульналітаратурнай канцэпцыі асобы прадугледжвае зварот да розных аспектаў самаідэнтыфікацыі герояў: узаемадзеянне з кансерватыўнай спадчыннай традыцыяй, нацыябудаўнічымі і культуратворчымі працэсамі [2–А, 7–А, 8–А, 10–А, 14–А, 20–А, 28–А, 31–А].

2. Адчуванне прыналежнасці да групы блізкіх людзей складае аснову чалавечага быцця, але змены канца XIX – пачатку XX ст. уносяць карэктывы ва ўзаемадзеянне членаў сям'і. Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў акцэнтуе значнасць сямейна-родавай самаідэнтыфікацыі герояў, ажыццяўленне якой напоўнена патрыятычным зместам. Айчынныя пісьменнікі сцвярджаюць неабходнасць гарманічнага ўзаемадзеяння чалавека з родным асяроддзем: вобраз інтэлігента ў першым пакаленні, несучы ініцыяцыйны змест ("У лазні" М. Гарэцкага), выяўляе важнасць апоры на папярэднікаў у грамадскім развіцці ("Роднае карэнне" М. Гарэцкага), хоць не ўсе героі абіраюць пазітыўны сцэнарый станаўлення ("На Каляды к сыну" З. Бядулі, "Сын вёскі" У. Галубка). У прозе суседзяў, дзе згаданая ідэя не з'яўляецца магістральнай, прысутнічае шырэйшы сюжэтна-тэматычны ахоп асвятлення канфліктных стасункаў чалавека з членамі сям'і: кропкамі сутыкнення выступаюць узаемадзеянне з каланізатарамі, у тым ліку заключэнне змешаных шлюбаў ("«Немчыкі»" М. Канапніцкай), ідэйна-светапоглядныя разыходжанні прадстаўнікоў аднаго ці розных пакаленняў ("Афіцэр" Э. Ажэшка, "Рэха лясоў" С. Жэромскага). Абставіны мадэрну падштурхоўваюць да свядомага выбудоўвання сябе праз сепарацыю ад асяроддзя ў бок развіцця ўласнай індывідуальнасці з захаваннем добрых стасункаў з блізкімі. У тагачасных грамадска-гістарычных умовах дасягненне сталай сямейна-родавай ідэнтычнасці нярэдка не толькі складанае, але і немагчымае ("Рунь" М. Гарэцкага, "Доктар Пётр" С. Жэромскага). Беларускія празаікі асноўную трансфармацыйную нагрузку кладуць на маладое пакаленне, польскія – на старэйшае [1–А, 15–А, 16–А, 17–А, 21–А, 23–А].

3. Разгледжаная праз прызму рэлігійнага светапогляду канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў памежжа XIX–XX стст. паказвае прыкметы змен у сістэме каштоўнасцей чалавека. Пісьменнікі на матэрыяле жыццёвых сітуацый герояў асэнсоўваюць вагу і трываласць ідэалістычных і

матэрыялістычных поглядаў (“Стары прафесар” М. Гарэцкага, “Прывід” Б. Пруса), параўноўваюць храмавы і мірскі шляхі служэння Богу (“Чарнічка” і “Памылка” М. Гарэцкага, “Спакуса” С. Жэромскага). Веравызнанне і канфесійная гісторыя народаў накладваюць адбітак на духоўны досвед чалавека: нацыянальныя адрозненні абумоўлены вялікай вагой язычніцтва ў айчынным жыцці і абмежаваннямі каталіцтва ў суседзяў. У беларускай прозе малых жанраў селянін не заўсёды вытрыманы ў веры і выкананні рытуалаў (“Круцель” У. Галубка), што ў польскай – сустракаецца толькі ў выглядзе выключэння (“Нявернік” У. Оркана). У суседзяў рэлігійнае жыццё асобы нярэдка пазначана радыкальным пратэстам супраць касцёла (С. Пшыбышэўскі): у мадэрнісцкіх творах Бог спазнаецца ва ўзаемадзеянні з супрацьлеглым полам (“Перад світаннем” У. Рэйманта), пад сумненне ставіцца існаванне Усявышняга (“Паехала” і “Доказ” Е. Жулаўскага). Разам з тым прысутнічаюць прыклады празаічных гімнаў духавенству (“Ксёндз Пётр” К. Пшэрвы-Тэтмаера), прадстаўнікі якога ў айчыннай прозе малых жанраў, дзе звычайны бядняк роўнавялікі святым (“Вялікі пост” З. Бядулі), паказваюцца з гумарам і пераважна як другасныя героі (Я. Колас). Польская проза ў аслабленні веры ў асяроддзі сялянства, расчараванні ў ёй ацэнтуе знешні негатыўны ўплыў – прымусовы перавод з адной канфесіі ў іншую (“Да свайго Бога” і “Язычнік” С. Жэромскага). Беларускія аўтары прад’яўляюць высокія патрабаванні да герояў па самаўдасканаленні незалежна ад абставінаў (“Панас на небе” і “Сон Анупрэя” З. Бядулі, “Прысяга” М. Гарэцкага), паказваюць чалавека, які спасцігае Бога не ў межах веравызнання, а асацыюючы красу наваколля са святасцю (“На начлезе” Я. Коласа) [11–А, 32–А, 33–А, 35–А, 37–А].

4. Калі рэлігія перастае быць аб’яднальным фактарам для народа, а межы дзяржавы не адпавядаюць іх унутранаму адчуванню, чалавек пачынае пошук іншых апор. Канцэпцыя асобы ў беларускай і польскай прозе малых жанраў памежжа стагоддзяў адлюстроўвае асэнсаванне героямі спадчыннага права на сваю гістарычную тэрыторыю і мову як агульную духоўную каштоўнасць. У жанры мініяцюры прысутнічае пазітыўна інтэрпрэтаваная, у адрозненне ад фатальнага філасофскага погляду, цыклічная мадэль культурна-гістарычнага хранатопа. У ёй роля асобы ў гісторыі нівелюецца ўстаноўкай на дэтэрмінаванасць падзей: размешчаны на перыферыі мастацкай прасторы герой выглядае размытым, таму што аўтары ўвасабляюць вобраз нацыянальнай супольнасці ў яе руху ў часе. У польскіх творах дамінуе вобраз соннага народа, які павінен прытрымлівацца прадвызначанага шляху, чакаць спрыяльнага моманту гісторыі (“Сонныя рыцары” К. Пшэрвы-Тэтмаера, “Звон з расколінай” У. Рэйманта), але мае месца і спрэчка з такім падыходам (“Сон пра шпагу” С. Жэромскага). Нацыянальныя разыходжанні ў канцэпцыі асобы звязаны з

адсутнасцю ў айчыннай рэчаіснасці, у параўнанні з суседзямі, сфарміраванай, падрыхтаванай да ўдзелу ў грамадска значных падзеях супольнасці (“Жывая вада” Я. Коласа). У беларускіх мініяцюрах на парадку дня стаіць задача нацыянальнага самаўсведамлення, з чым звязаны перанос біблейскіх сюжэтаў з жыцця чалавека на поступ народа і ідэя ахвярнасці (“Вёска” і “Хрыстос уваскрос!” С. Палуяна, “Мары” В. Ластоўскага).

Мова ўспрымаецца чалавекам як архетыпова значная з’ява, якая стагоддзямі і гуртуе этнас, забяспечваючы стасункі паміж людзьмі, і адрознівае яго ад іншых. Канцэпцыя асобы, разгледжаная ў аспекце ролі роднай гаворкі ў захаванні традыцыі, паказвае: у нацыянальным жыцці суседзяў моўнае пытанне і патрыятычныя пачуцці цесна звязаны з касцёлам (“У вінным форце” М. Канапніцкай, “У прускай школе” У. Рэйманта), а забарона сродку зносінаў рушыць лёсы і пагражае ліквідацыяй супольнасці (“Карл Круг” А. Свентахоўскага, “З дзённіка пазнанскага настаўніка” Г. Сянкевіча). Беларусы засяроджаны на сцвярджэнні вартасці мовы як адвечнай каштоўнасці і перад іншымі народамі, і перад сваім (“Пан Шабуневіч” А. Гаруна, “Рунь” М. Гарэцкага, “«Дзеравеншчына»” Я. Коласа, “Мая вёска” Цёткі). Роднае слова за межамі радзімы для герояў – апазнавальны знак і напамін пра сваю этнакультурную сутнасць. У польскіх творах значнасць моўнага дыскурсу сцвярджаецца ўзвелічэннем ключавых для нацыянальнай супольнасці тэкстаў – Бібліі, “Пана Тадэвуша” А. Міцкевіча (“У 1835 годзе” М. Канапніцкай, “Вартаўнік маяка” і “Сустрэча ў Марыпозе” Г. Сянкевіча), у айчынных – вагу маюць самі гукі роднай мовы, таму што агульныя з суседзямі творы не валодаюць патрыятычным патэнцыялам у сувязі з устаноўкай на стварэнне беларускамоўнай літаратуры (“Свята А. Гаруна, “Амерыканец” і “Уцекачы” М. Гарэцкага) [4–А, 13–А, 19–А, 24–А, 30–А].

5. Уздым культуры і наданне значнасці яе стваральніку робіць актуальнай на мяжы XIX–XX стст. канцэпцыю творчай асобы. Адной з яе праяў у беларускай і польскай прозе малых жанраў выступае вобраз адоранага вясковага дзіцяці (“Велікодныя яйкі” З. Бядулі, “Скрыпачка” М. Гарэцкага, “Антэк” Б. Пруса, “Янка-музыкант” Г. Сянкевіча). Яно перажывае складанасці ў станаўленні з-за адрознасці ад калектыву, у якім творчасць не лічыцца абавязковым і вартым заняткам. Герой не здольны прыносіць карысць у матэрыяльна-побытавай сферы жыцця, затое надзелены абвостранай чуллівасцю, духоўным арыстакратызмам. Асяроддзе не ў стане зразумець каштоўнасць такой асобы і не валодае ні інтэлектуальнымі, ні матэрыяльнымі рэсурсамі, каб садзейнічаць яе развіццю. Асноўную праблему станаўлення таленавітага селяніна складае адсутнасць апоры на папярэднікаў і перспектыва разрыву з родавай справай. Эстэтычна развітае дзіця можа быць

запатрабаваным у сферы стварэння культуры, але яго лёс нярэдка бачыцца аўтарам трагічным. Увасобленая сродкамі рэалізму ў межах пазітывісцкага светапогляду, але не пазбаўленая ўплыву мадэрнізму, такая канцэпцыя творчай асобы выяўляе грамадскі клопат пра духоўны патэнцыял народа.

У прозе малых жанраў з фальклорным, прытчавым пачаткам у абедзвюх літаратурах прысутнічае вобраз народнага выканаўцы, які ўказвае на значнасць музычнай стыхіі ў мастацтве і ў жыцці (“Музыка” М. Багдановіча, “Пра Звырталу-музыку” К. Пшэрвы-Тэтмаера). З дапамогай сродкаў камічнага прадстаўлены творца сталага ўзросту: з перавагай іроніі – у беларускіх апавяданнях і добрай сатыры – у польскіх акцэнтуецца прафесійная несамавітасць асобы (“Зіма” М. Гарэцкага, “Паэт і свет” Б. Пруса) і яе канфрантацыя з філістарамі і крытыкамі (“На углу”, “Около театра миниатюр”, “После концерта Яна Кубелика”, “Вясной” М. Багдановіча, “Фіялетавыя панчохі” Г. Запольскай, “З дзённіка” У. Рэйманта, “Тая трэцяя” Г. Сянкевіча). Неперарванасць моўнай традыцыі ў літаратуры суседзяў спрыяе з’яўленню вобраза сталага творцы (“Ацалелы” С. Жэромскага), які рэфлексуе над сваёй дзейнасцю (“Пасля ўрачыстасці” Е. Жулаўскага, “Лаўрэат” К. Пшэрвы-Тэтмаера), заглыбляецца ў пытанні майстэрства (“Душа чалавека” К. Пшэрвы-Тэтмаера). Квінтэсенцыяй унутранага свету прадстаўніка творчай прафесіі выступаюць апавяданні “Ad leones!” Ц. Норвіда і “Апокрыф” М. Багдановіча: у польскага аўтара канцэпцыю асобы вызначае перспектыва камерцыялізацыі мастацтва і неабходнасць выбару паміж вернасцю эстэтычнаму ідэалу і заробкам, у беларускага – укаранёная ў драматычным разрыве з традыцыяй праблема дазволу сабе вывесці ўласную дзейнасць за межы спадарожнага занятку. Айчынныя аўтары імкнуцца сцвердзіць не толькі творцу як паўнавартаснага члена працоўнага калектыву, але і права чалавека на прыгажосць у штодзённым жыцці (“У досвітку”, “Ці я вінават?..” З. Бядулі, “На ўсходзе сонца” Ц. Гартнага, “Васількі” Ядвігіна Ш.) [3–А, 5–А, 6–А, 9–А, 12–А, 18–А, 22–А, 25–А, 26–А, 27–А, 29–А, 34–А, 36–А, 38–А].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Асноўныя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні беларускай і польскай літаратур, у тым ліку кампаратыўным, у межах розных галін літаратуразнаўства. Матэрыялы будуць задзейнічаны ў адукацыйнай сістэме – падрыхтоўцы падручнікаў і спецыяльных курсаў, правядзенні факультатываў па гісторыі літаратуры. Атрыманыя высновы будуць запатрабаваны ў міждысцыплінарных даследаваннях гуманітарнага профілю, у прыватнасці антрапалагічнай скіраванасці.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях

1–А. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў пераходным перыядзе: сімвалічнае прачытанне прозы “малога жанру” / Н.Л. Бахановіч // Вестн. Мин. гос. лингвист. ун-та. Сер. 1, Филология. – 2008. – № 5. – С. 190–197.

2–А. Бахановіч, Н.Л. Літаратуразнаўчае даследаванне асобы: метадалагічны і аксіялагічны аспекты / Н.Л. Бахановіч // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2008. – № 4. – С. 48–52.

3–А. Бахановіч, Н.Л. Трагедыя талента і дылетанта: творчая асоба ў пачатку XX стагоддзя / Н.Л. Бахановіч // Acta Albaruthenica. – Т. 8: Polsko-białoruskie związki literackie, językowe i historyczne-kulturalne / Kat. Bałorutenistyki Uniw. Warszawskiego; red. nauk.: M. Timoszuk, M. Chaustowicz. – Warszawa, 2008. – S. 8–16.

4–А. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў цыклічнай мадэлі нацыянальнага быцця: на матэрыяле твораў беларускай і польскай літаратур пачатку XX ст. / Н.Л. Бахановіч // Род. слова. – 2009. – № 5. – С. 28–31.

5–А. Баханович, Н.Л. Творчество и эстетическое на рубеже XIX–XX ст.: художественно-философский экскурс / Н.Л. Баханович // Мова і культура / Київ. нац. ун-т, Вид. дом Д. Бураго. – Вип. 12. – Т. 2; редкол.: Д. Бураго (гол. ред.) [і інш.]. – Київ, 2009. – С. 260–266.

6–А. Бахановіч, Н.Л. Канцэпцыя творчай асобы ў лірычнай прозе Змітрака Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2011. – № 1. – С. 88–93.

7–А. Бахановіч, Н.Л. Тэндэнцыі развіцця беларускай і польскай прозы малых жанраў на памежжы XIX–XX стст. у “антрапалагічным” вымярэнні / Н.Л. Бахановіч. – Веснік Гродз. дзярж. ун-та. – 2012. – № 3. – С. 6–12.

8–А. Бахановіч, Н. Беларуская і польская літаратуры мяжы XIX–XX стст.: узаемадзеянне мастацкіх метадаў і плыней / Н. Бахановіч // Białorutenistyka Białostocka / Uniw. w Białymstoku, Wydz. Filologiczny, Kat. Filologii Białoruskiej; red.: H. Twaranowicz [et al.]. – Białystok, 2013. – T. 5. – S. 251–267.

9–А. Бахановіч, Н. Ідэйна-мастацкія пошукі Ежы Жулаўскага ў асяроддзі галіцыйскай інтэлігенцыі / Н. Бахановіч // Україна: культурна спадщина, національна свідомість, державність. – Вип. 23; Нац. акад. наук України, Ін-т українознавства імені І. Крип’якевича; гол. редкол.: М. Литвин. – Львів, 2013. – С. 325–337.

10–А. Бахановіч, Н. Беларуска-польскія літаратурныя сувязі: метадалагічныя аспекты даследавання / Н. Бахановіч // Białorutenistyka

Białostocka / Uniw. w Białymstoku, Wydz. Filologiczny, Kat. Filologii Białoruskiej; red.: H. Twaranowicz [et al.]. – Białystok, 2015. – T. 7. – S. 215–225.

11–А. Бахановичс, Н. Человек и религия в прозе малых жанров рубежа XIX–XX веков / Н. Баханович // Studia Rossica Gedanensia. – T. 6; red.: Z. Kaźmierczyk, K. Wojan. – Gdańsk, 2019. – S. 59–70.

12–А. Бахановіч, Н.Л. Вобраз творчай асобы ў беларускай і польскай малой прозе мяжы XIX–XX ст.: параўнальны аспект / Н.Л. Бахановіч // Acta Albaruthenica. – T. 22 : z okazji 140 rocznicy urodzin J. Kupały / Kat. białorutenistyki Uniw. Warszawskiego; red. M. Chaustowicz [etc.]. – Warszawa, 2022. – S. 169–183.

13–А. Бахановіч, Н.Л. Беларуская проза пачатку XX стагоддзя: этнакультурная і моўная ідэнтычнасць асобы / Н.Л. Бахановіч. – Полымя. – 2023. – № 1. – С. 67–72.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

14–А. Бахановіч, Н.Л. Праблема асобы на мяжы XIX–XX стагоддзяў / Н.Л. Бахановіч // Шостыя Танкаўскія чытанні: да 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння М. Танка : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: А.І. Лугоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 14–15.

15–А. Бахановіч, Н.Л. Статус лесніка ў феадальным грамадстве: кампаратыўны аспект / Н.Л. Бахановіч // Дзясятыя Танкаўскія чытанні (да года культуры ў Беларусі) : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: В.Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 25–29.

16–А. Бахановіч, Н.Л. Ініцыяцыйная проза Максіма Гарэцкага / Н.Л. Бахановіч // Спадчына І.Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. – Вып. 3 / Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: І.Ф. Штэйнер (гал.рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2016. – С. 37–42.

17–А. Бахановіч, Н.Л. Беларуская і польская “малая” проза мяжы XIX–XX стст. праз прызму сямейна-родавай самаідэнтыфікацыі асобы / Н.Л. Бахановіч // Беларуска-польскія культурна-моўныя ўзаемадачыненні: ад гісторыі да сучаснасці : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі [і інш.]; навук рэд.: В.М. Курцова [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 272–286.

18–А. Бахановіч, Н.Л. Творчыя пошукі асобы ў люстэрку дыскусій на старонках мастацкіх твораў памежжа XIX–XX стст. / Н.Л. Бахановіч // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства : зб. навук. арт. да 90-годдзя Ін-та літ-ва імя Я. Купалы / Нац. акад. навук Беларусі [і інш.]; уклад. Н.В. Якавенка; навук. рэд. І.В. Саверчанка. – Мінск, 2022. – С. 188–195.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

19–А. Бахановіч, Н.Л. Закон захавання энергіі ў літаратуры: на матэрыяле апавядання "Трэснуты звон" У. Рэйманта і казкі "Жывая вада" Я. Коласа / Н.Л. Бахановіч // Идеи. Поиски. Решения : материалы I респ. науч.-практ. конф., Минск, 28 марта 2008 г. : в 2 т. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: Н.Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – Т. 2. – С. 49–52.

20–А. Баханович, Н.Л. Белорусская литература и проблема человека на границе XIX–XX столетий: актуальность исследования / Н.Л. Баханович // Проблемы славянской культуры и цивилизации : материалы X междунар. науч.-метод. конф., Уссурийск, 22 мая 2008 г. / Уссур. гос. пед. ин-т; отв. ред. А.М. Антипова. – Уссурийск, 2008. – С. 350–353.

21–А. Баханович, Н.Л. Художественное исследование старости на рубеже XIX–XX веков / Н.Л. Баханович // Ломоносов – 2009 : материалы XVI междунар. науч. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых. Секция "Филология", Москва, 13–17 апр. 2009 г. / М-во науки и образов. Рос. Федерации, Моск. гос. ун-т; редкол.: Е.И. Кислова (ред.-сост.). – М., 2009. – С. 238–240.

22–А. Бахановіч, Н.Л. Праблема творчай асобы ў апавяданні "Бондар" З. Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі : матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 19–20 мая 2009 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ.; рэдкал.: М.А. Тычына (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 222–226.

23–А. Бахановіч, Н.Л. Мастацкае перажыванне старасці як індыкатар пераходнага грамадства / Н.Л. Бахановіч // Юбилейная научно-практическая конференция, посвящ. 40-летию Гомел. гос. ун-та : материалы, Гомель, 11 июня 2009 г. : в 4 ч. / М-во образов. Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т; рэдкол.: О.М. Демиденко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2009. – Ч. 1. – С. 177–180.

24–А. Бахановіч, Н.Л. Асоба ў цыклічнай мадэлі культурна-гістарычнага хранатопа (на матэрыяле прозы В. Ластоўскага і К. Тэтмаера) / Н.Л. Бахановіч // Droga ku wzajemności: polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe : materiały XI miedz. nauk. konf., Białystok, 25–26 wrześ. 2009 r. / Białorus. tow-wo społeczno-kulturalne w Polsce [etc.]; red.: M. Kondratiuk, B. Siegień. – Białystok, 2009. – S. 345–351.

25–А. Бахановіч, Н.Л. Пакута як ідэйна-мастацкі прынцып рэпрэзентацыі асобы ў лірычнай прозе Змітрака Бядулі / Н.Л. Бахановіч // Творчасць Івана Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы рэсп. навук. канф. да 85-годдзя з дня нараджэння нар. пісьменніка Беларусі акад.

І. Навуменкі, Мінск, 16 лют. 2010 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ.; рэдкал.: С.С. Лаўшук (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 113–117.

26–А. Баханович, Н.Л. Сон как способ творчества в миниатюрах Ежи Жулавского / Н.Л. Баханович // Ломоносов – 2010 [Электронный ресурс]: материалы XVII междунар. науч. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых. Секция “Филология”, 12–15 апр. 2010 г. – М., 2010. – Режим доступа: http://www.lomonosov-msu.ru/archive/Lomonosov_2010/24-6.pdf. – Дата доступа: 9.04.2023.

27–А. Бахановіч, Н.Л. Максім Багдановіч і Змітрок Бядуля: мастацкі дыялог пра творцу / Н.Л. Бахановіч // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры : матэрыялы міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча, Мінск, 25–26 лістап. 2011 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ.; рэдкал.: А.А. Манкевіч (уклад.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 61–64.

28–А. Бахановіч, Н.Л. Мастацкая канцэпцыя асобы на мяжы XIX–XX стст. у аспекце фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі / Н.Л. Бахановіч // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси (к 90-летию создания Института белорусской культуры) : материалы междунар. науч. конф., Минск, 8 дек. 2011 г.; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Минск, 2012. – С. 515–520.

29–А. Бахановіч, Н. Спецыфіка творчасці лірычнага героя Ежы Жулаўскага / Н.Л. Бахановіч // Императивы творчества и гармонии в проектировании человекомерных систем : материалы междунар. науч. конф., Минск, 15–16 нояб. 2012 г., Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т филос. – Минск, 2013. – С. 427–429.

30–А. Бахановіч, Н.Л. Інтэрпрэтацыя нацыянальнай гісторыі ў “казцы жыцця” “Жывая вада” Якуба Коласа / Н.Л. Бахановіч // “Іх думкі лунаюць яшчэ над Нясвіжам” : матэрыялы літ. чытанняў, прысвеч. 130-годдзю з дня нараджэння нар. паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа, Нясвіж, 15 ліст. 2012 г. – Нясвіж, 2013. – С. 36–45.

31–А. Бахановіч, Н.Л. Парадыгмы беларускай “прысутнасці” ў польскім літаратурным полі / Н.Л. Бахановіч // Интеллектуальная культура Беларуси. Истоки, традиции, методология исследования : материалы I межд. научн. конф., Минск, 13–14 нояб. 2014 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т филос.; редкол.: А.А. Лазаревич [и др.]. – Минск, 2015. – С. 531–534.

32–А. Бахановіч, Н.Л. Б. Прус і М. Гарэцкі пра выпрабаванне “веры”: экзістэнцыяльныя сувязі чалавека з трансцэндэнтным / Н.Л. Бахановіч // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства : матэрыялы міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння К. Крапівы,

Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр динслед. беларус. культуры, мовы, літ. – Мінск, 2016. – С. 220–223.

33–А. Бахановіч, Н.Л. Літаратура пра духоўны патэнцыял царкоўнага і мірскога жыцця / Н.Л. Бахановіч // Философия в цивилизационном контексте : сб. трудов по материалам междунар. науч. конф. “Философское знание и вызовы цивилизационного развития”, Минск, 21–22 апр. 2016. г. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т филос.; редкол. : А.А. Лазаревич [и др.]. – Минск, 2017. – С. 396–399.

34–А. Бахановіч, Н. Мастацкая спецыфіка ранняй прозы Цішкі Гартнага / Н. Бахановіч // Капыльскія чытанні – 2017: да 130-годдзя з дня нараджэння беларускага грамадскага і дзяржаўнага дзеяча, акадэміка Акад. навук БССР, пісьменніка З.Х. Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Капыль, 20 кастр. 2017 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск, 2017. – С. 72–76.

35–А. Бахановіч, Н.Л. Рэлігійны фактар у станаўленні асобы (на матэрыяле малой позы М. Гарэцкага) / Н.Л. Бахановіч // Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы (да 125-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага) : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22–23 сак. 2018 г. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літ-ва імя Я. Купалы; уклад. А.А. Манкевіч; навук. рэд. С.С. Лаўшук. – Мінск, 2018. – С. 147–151.

36–А. Бахановіч, Н.Л. Праблема творчага станаўлення дзяцей вёскі ў літаратуры памежжа XIX–XX стст. / Н.Л. Бахановіч // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы III рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 20–21 ліст. 2019 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал.: Г.А. Арцямёнак (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2019. – С. 144–147.

37–А. Бахановіч, Н.Л. Рэлігійная самаідэнтыфікацыя асобы ў “малой” прозе Якуба Коласа / Н.Л. Бахановіч // Наследие святых Кирилла и Мефодия в мировой духовной культуре : сб. докладов Юбилейных XXV междунар. Кирилло-Мефодиевских чтений; Минск, 30–31 мая 2019 г. / Белорус. Экзархат РПЦ, Ин-т теологии имени Св. Мефодия и Кирилла Белорус. гос. ун-та; редкол.: С. Шатравский, С. Рогальский. – Минск, 2020. – С. 223–227.

38–А. Бахановіч, Н. Эстэтычнасць і музыкальнасць Коласа-празаіка / Н. Бахановіч // Каласавіны 2020 : матэрыялы XXXIV навук. канф., Мінск, 2 кастр. 2020 / Мін-ва культ. Рэсп. Беларусь, Дзярж. літ.-мемар. музей Я. Коласа; склад.: І.М. Казловіч. – Мінск, 2020. – С. 118–124.

## РЭЗЮМЭ

**Бахановіч Наталля Леанідаўна**

## КАНЦЭПЦЫЯ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРАЎ НА ПАМЕЖЖЫ XIX–XX СТСТ.

**Ключавыя словы:** кампаратыўны аналіз, проза малых жанраў, канцэпцыя асобы, аўтар, аўтарская пазіцыя, герой, чалавек, самаідэнтыфікацыя, род, рэлігія, культура, нацыянальны, творчая асоба

**Мэта дысертацыі –** шматаспектны параўнальны аналіз прысутных у беларускай і польскай прозе малых жанраў на мяжы XIX–XX стст. уяўленняў пра асобу ў яе стаўленні да сваіх светапоглядных вытокаў і асэнсаванні духоўных каштоўнасцей, далучанасці да грамадска-культурных працэсаў і творчай рэалізацыі.

**Метады даследавання** – параўнальны, культурна-гістарычны, элементы кантэкстуальнага, герменеўтычнага, біяграфічнага.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Паглыблены веды пра беларускую і польскую літаратуры ў перыяд іх станаўлення як асобных эстэтычных сістэм. У параўнальным аспекце на аснове сюжэтна-тэматычнага і мастацка-вобразнага аналізу прозы малых жанраў выяўлена канцэпцыя асобы як сукупнасць уяўленняў пра чалавека ў яго ўзаемадзеянні з традыцыяй – родам і верай, нацыябудаўнічымі і культуратворчымі працэсамі. У айчынны навуковы зварот уведзена вялікая колькасць польскіх твораў малых жанравых формаў. Паглыблены веды пра тагачасныя рэаліі жыцця чалавека і грамадства за кошт устанаўлення таго, што ў мастацтве слова абодвух народаў пры падобных, хоць і не ідэнтычных умовах праяўляецца выразна ці з некаторымі адрозненнямі або ў адным – становіцца тэндэнцыяй, а ў другім – адсутнічае ці застаецца ў зародку.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні і галіна прымянення атрыманых вынікаў.** Матэрыялы дысертацыі запатрабаваны ў даследаваннях беларускай і польскай літаратур, у тым ліку ў галіне кампаратывістыкі, у навукова-адукацыйнай сістэме гуманітарнага профілю для стварэння падручнікаў, пры чытанні лекцый і спецкурсаў па літаратуры. Практычная значнасць вынікаў заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў міждысцыплінарных даследаваннях асобы.

# РЕЗЮМЕ

**Баханович Наталья Леонидовна**

## КОНЦЕПЦИЯ ЛИЧНОСТИ В БЕЛОРУССКОЙ И ПОЛЬСКОЙ ПРОЗЕ МАЛЫХ ЖАНРОВ НА РУБЕЖЕ XIX–XX СТСТ.

**Ключевые слова:** компаративный анализ, проза малых жанров, концепция личности, автор, авторская позиция, герой, человек, самоидентификация, род, религия, культура, национальный, творческая личность

**Цель диссертации** – многоаспектный сравнительный анализ присутствующих в белорусской и польской прозе малых жанров на рубеже XIX–XX стст. представлений о личности в ее отношении к своим мировоззренческим истокам и осмыслении духовных ценностей, сопричастности общественно-культурным процессам и творческой реализации.

**Методы исследования** – сравнительный, культурно-исторический, элементы контекстуального, герменевтического, биографического.

**Полученные результаты и их новизна.** Углублены знания о белорусской и польской литературах в период их становления как отдельных эстетических систем. В сравнительном аспекте на основе сюжетно-тематического и образно-художественного анализа прозы малых жанров выявлена концепция личности как совокупность представлений о человеке во взаимодействии с традицией – родом и верой, нациестроительными и культуротворческими процессами. В отечественный научный оборот введено большое количество польских произведений малых жанровых форм. Углублены знания о реалиях жизни человека и общества того времени за счет установления того, что в искусстве слова обоих народов при подобных, хоть и не идентичных условиях проявляется выразительно или с некоторыми отличиями либо в одном – становится тенденцией, а в другом – отсутствует или остается в зародыше.

**Рекомендации по использованию и область применения полученных результатов.** Материалы диссертации востребованы в исследованиях белорусской и польской литератур, в том числе в области компаративистики, в научно-образовательной системе гуманитарного профиля для создания учебников, при чтении лекций и спецкурсов по литературе. Практическая значимость результатов заключается в возможности их использования в междисциплинарных исследованиях личности.

## SUMMARY

**Natalia Bakhanovich**

# THE CONCEPT OF PERSONALITY IN BELARUSIAN AND POLISH SHORT GENRES PROSE AT THE TURN OF 19th and 20th CENTURIES

**Keywords:** comparative analysis, short genres prose, personality concept, author, author’s position, hero, person, self-identification, genus, religion, culture, national, creative personality

**The purpose of research** is to carry out a comparative multidimensional analysis of Belarusian and Polish small genre prose at the turn of the $19^{th}$ and $20^{th}$ centuries. It aims to reveal the essence of personality in relation to its world-view origins, its perception of spiritual values, its involvement in social and cultural processes and creative realization.

**The methods of research** are comparative, cultural and historical, elements of contextual, hermeneutic, biographical.

**The obtained results and their novelty.** The knowledge of Belarusian and Polish literatures during their formation as separate aesthetic systems was deepened. In a comparative aspect on the basis of the plot-thematic and artistic-figurative analysis of the prose of short genres, the concept of a person as a set of ideas about an individual in his interaction with tradition – family and faith, national-building and culture-creative processes are revealed. A large number of Polish works of short genre forms were introduced into the national scientific turnover. The knowledge of the realities of human life and society at that time has been deepened by establishing what in the art of speech of both nations under similar, though not identical conditions, manifests itself expressively or with some differences, or in one becomes a trend while in the other is absent or remains in the bud.

**Recommendations for use and field of application of the results obtained.** Materials of the dissertation are demanded in researches of Belarusian and Polish literature, including comparative studies, in scientific and educational system of the humanities for manuals creation, when teaching lectures and special courses in literature. The practical significance of the results lies in the possibility of their use in interdisciplinary studies of personality.

Падпісана да друку 18.10.2023. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 60 экз. Заказ 346.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.